View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



**УДК 94(476)**

**РАДЗІВІЛЫ І ПОЛАЦКАЯ ШЛЯХТА Ў КАНЦЫ XVI – СЯРЭДЗІНЕ XVII стст.**

***канд. гіст. навук, дац. В.У. ГАЛУБОВІЧ***
**Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт**

*Разглядаюцца асобныя аспекты ўзаемадзеяння полацкай шляхты з магнацкім домам Радзівілаў. Звяртаецца асаблівая ўвага на памеры ўплыву Разівілаў на грамадска-палітычнае жыццё мясцовых абывацеляў.*

Арыстакратычныя сем'і адыгралі ў айчыннай гісторыі адметную ролю, магчыма, нават крыху перабольшаную ў цяперашні час у сувязі з актыўнай папулярызацыяй гісторыка-культурнай спадчыны. На Беларусі сярод "найбуйнейшых" магнацкіх родаў, у першую чаргу, называюць Радзівілаў [2, с. 503], што мае пад сабой важкія падставы. Удалая палітычная стратэгія, акумуляваныя эканамічная рэсурсы і такая небанальная рэч, як адносна добрая генетыка, забяспечылі гэтым магнатам унікальныя пазіцыі ў жыцці Вялікага Княства Літоўскага. У вядомым даведніку "*Цэнтральныя ўраднікі і саноўнікі Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стагоддзяў*" зафіксаваны ажно 42 прадстаўнікі роду, якія займалі пасады ў цэнтральнай адміністрацыі ВКЛ [29, s. 232–235]. Хаця колькасна Радзівілы і саступалі Сапегам, сярод якіх ажно 51 асоба зрабіла кар'еру на дзяржаўнай службе княства [29, s. 236–239], гэта зусім не азначае, што ўплывы "*паноў на Нясвіжы*" былі якасна меншымі. Сама прысутнасць Радзівілаў у часовым вымярэнні адносна раўнамерна размяркоўваецца на працягу ўсёй гісторыі ВКЛ, у той час як Сапегі магнацкі статус і адпаведныя амбіцыі набылі толькі цягам XVI ст., таму слушна лічацца другімі па значэнні пасля Радзівілаў [3, с. 545].

Калі ўвогуле пра дамінацыю Радзівілаў у жыцці княства спрачацца не выпадае, бо варта ў дадатак прыгадаць, што яны амаль заўсёды з'яўляліся галоўнымі гульцамі ў спаборніцтве за ўладу ў ВКЛ [6, с. 32–45], то ўзнікае спакуса праверыць гэтае сцверджанне і на лакальным узроўні. Відавочна, што памеры рэгіянальных уплываў магнацкага роду залежалі ад розных фактараў, але, у першую чаргу, былі абумоўлены наяўнасцю маёмасных уладанняў. Улічваючы апошняе, Радзівілы не маглі прэтэндаваць на нейкія спецыфічныя пазіцыі на ўсходзе ВКЛ. Гэта датычыцца і самага старажытнага беларускага рэгіёна – Полаччыны, які не выклікаў асаблівых апетытаў у Радзівілаў: па дадзеных рэвізіі 1552 г. у Полацкім ваяводстве радзівілаўскіх добраў не было [5]. Ды і намесніцка-ваяводскія пасады на ўсходзе іх асабліва не прываблівалі ні ў XV ст., ні ў XVI ст. [30, s. 44–46]. Што было ў падмурку такой незацікаўленасці? Адказ, несумненна, знаходзіцца на паверхні: размяшчэнне большасці ўладанняў Радзівілаў у заходніх і паўночных рэгіёнах ВКЛ. Такая структура ўласнасці была ўласціва прадстаўнікам і найбольш актыўнай напрыканцы XVI – першай палове XVII ст. біржанскай галіне роду [4, с. 68]. Усходнія землі ВКЛ уласна з гэтай прычыны не знаходзіліся ў ліку прыярытэтных рэгіёнаў, але з другой паловы XVI ст. сітуацыя стала змяняцца і пачаткова не з прычын з'яўлення тут буйнога землеўладання Радзівілаў. Пасля соймікавай рэформы адбылася частковая дэмакратызацыя і шляхецкія масы былі дапушчаныя да ўдзелу ў палітычным жыцці княства, што, з аднаго боку, фармальна абмежавала алігархію, але з іншага, стварыла новыя магчымасці для ўцягвання Радзівіламі ўсходніх частак ВКЛ у арбіту сваіх уплываў праз нізавыя, павятовыя структуры. Уласна гэтым паспрабавала скарыстацца галінаў роду Радзівілаў, якая высунулася на ролю правадыроў пратэстантызму ў ВКЛ, – біржанскія Радзівілы.

З сярэдзіны XVI ст. Полацкае ваяводства знаходзілася ў рэчышчы рэфармацыйнага руху, а ў першай палове XVII ст. здараліся канверсіі нават высокапастаўленых мясцовых ураднікаў: прызначаны ў 1613 г. полацкім ваяводам Міхал Друцкі Саколенскі перайшоў на некаторы час у кальвінізм, але пазней, пад уплывам Язафата Кунцэвіча, стаў каталіком [27, s. 159]. Наступнік М. Саколенскага, Януш Кішка, меў рэнамэ чалавека досыць няпэўнага, што да каталіцкай справы, бо паходзіў з пратэстанцкай сям'і [1, с. 14–15]. Кальвіністам быў Ян Сасноўскі, полацкі кашталян у 1654–1660 гг. [5, с. 69; 30, s. 127]. Функцыянаванне на Полаччыне дастаткова актыўнай пратэстанцкай супольнасці надавала рэгіёну важкасць у палітычных маніпуляцыях магнатаў. Канешне, тыя ж біржанскія Радзівілы цудоўна ўсведамлялі, што прыхільнасць да іх была абумоўлена не толькі статусам апекуноў і правадыроў пратэстантаў у ВКЛ, але, у значнай меры, іх матэрыяльнымі магчымасцямі і ўладальніцкімі інтарэсамі. Апошні фактар адыграў немалаважную ролю ў пачаткова кароткай гісторыі прысутнасці Радзівілаў на паўночным усходзе ВКЛ. У 1649 г. Ян Казімір надаў Янушу Радзівілу, польнаму гетману ВКЛ, шэраг значных уладанняў, а менавіта Невель і Себеж [7, с. 65–66, 76]. Манарх такім чынам вырашаў шэраг пытаняў: па-першае, арганізацыі абароны краю, якую зараз мусіў забяспечваць асабіста польны гетман; па-другое, гэта было формай падзякі гетману за службу. Як бы то не было, але Радзівілы станавіліся бліжэй да Полаччыны. Думаецца, што ў сувязі з гэтай "экспансіяй" на ўсход маглі быць звязаны і іншыя ініцыятывы, а менавіта, спробы атрымаць прадстаўнікамі асобных галінаў роду пасаду полацкага ваяводы.



polotsk.by

***Ваявода.*** Пасля смерці 13.I.1654 г. Януша Кішкі ўрад полацкага ваяводы быў на працягу некалькіх месяцаў двойчы нададзены Радзівілам, але ў абодвух выпадках пасада нібы спецыяльна "не даходзіла" да атрымальніка. У першым выпадку, а дакладней 3.III.1654 г., намінацыю атрымаў Аляксандр Людвік Радзівіл, маршалак ВКЛ, але стаць ваяводам ён не здолеў, бо памёр. У другім выпадку, ужо іншы Радзівіл – Багуслаў, канюшы ВКЛ, адмовіўся прыняць прывілей з прычыны захопу Полацка [1, с. 24–27]. Выпадак з Радзівіламі вельмі адметны яшчэ з таго пункту гледжання, што прызначэнне Аляксандра Людвіка мясцовая грамадскасць успрыняла негатыўна, а выбары Багуслава – станоўча. Натуральна гэтыя падзеі трэба разглядаць у кантэксце змагання полацкай шляхты за права выбару ваяводы, але цікава, што акурат біржанская фракцыя аказалася бліжэй да "народу" і здолела ў форс-мажорных абставінах арганізаваць элекцыю. Між тым ролю А.Л. Радзівіла ў цэлым трэба лічыць станоўчай, паколькі акурат яго дзеянні падштурхнулі палачанаў да актыўнага супраціву. У выніку ж, дзякуючы Радзівілам (!) і іх пратэстанцкім прыхільнікам з ліку полацкай шляхты, працэс аднаўлення старажытнага, няхай і фармальнага, права выбару ваяводы стаў рэальнасцю.

Той факт, што Радзівілы ў значнай ступені канцэнтравалі ў сваіх руках цэнтральныя ўрады ў ВКЛ, прымушаў павятовыя эліты няспынна камунікаваць з дварамі магнатаў. Так, ва ўмовах стабільнай нетрываласці міру і заўсёдных тэрытарыяльных спрэчак паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай полацкая шляхта была вымушана звяртацца за падтрымкай да вайсковага кіраўніцтва дзяржавы, якое з нязначнымі перапынкамі кантралявалася прадстаўнікамі роду Радзівілаў. У перыяд праўлення дынастыі Вазаў гетманства (вялікае і польнае) цалкам выпадала з рук гэтых магнатаў толькі ў 1603–1615 гг., 1640–1646 гг. і 1655–1668 гг. [29, s. 42–43, 46–47]. Асабліва такая камунікацыя нарастала ў час вайсковых дзеянняў. Прыкладам можа быць пасланне ад імя абывацеляў Полацкага ваяводства да Крыштапа Радзівіла ад 6.XII.1632 г. з паведамленнем пра напад маскоўцаў, якія "*ужо нямала замкаў апанавалі*". Палачане, не маючы магчымасці абараняцца, пісалі, што "*не чакаюць дапамогі ніадкуль, толькі з неба*". Спадзяванні ж на зямныя сілы звязваліся выключна з гетманам, як "*абаронцам Айчыны, які на сваіх плячах мае насіць бяспеку Айчыны*" [9, s. 1].

***Памеры камунікацыі.*** На колькі далёка сягалі шчупальцы радзівілаўскага "спрута" вельмі яскрава сведчыць такі важны сродак камунікацыі, як ліставанне. Акурат у складзе Архіва Радзівілаў захоўваюцца эпісталярыі розных прадстаўнікоў роду з элітай Полацкага ваяводства:

***ваяводаў***: лісты Мікалая Дарагастайскага 1589–1588 гг., Міхала Друцкага Саколенскага 1602–1621 гг., Януша Кішкі 1618–1653 гг. [12, 21, 14];

***кашталянаў***: лісты Яна Сасноўскага 1626–1639 гг., Крыштапа Рудаміны Дусяцкага 1648, Яна Корсака 1666–1669 гг. [21, 20, 16];

***падкаморыяў***: лісты Мікалая Францкевіча Радзімінскага 1589–1602 гг., Пятра Бяганскага 1653 г. [13, 11];

***падваяводы:*** лісты Яна Лісоўскага 1633–1651 гг. [18];

***падсудка***: Яна Падбіпенты 1660 г. [19];

***гараднічага:*** Францішка Жука 1599 г.[24];

***пісара гродскага:*** Мікалая Корсака 1620 г. [17];

***мясцовых актывістаў***: Пятра Стаброўскага 1589–1618 гг., Андрэя Канінскага 1632-1638 гг. [23, 14].

Зразумела, што далёка не ўся інфармацыя, якая сустракаецца ў лістах, датычыцца ўласна спраў Полаччыны, хаця і такіх звестак хапае, але сама колькасць і аўтарытэт асоб, уцягнутых у арбіту радзівілаўскай палітыкі, сведчыць пра перманентную і невыпадковую зацікаўленасць у атрыманні інфармацыі і кантролі за сітуацыяй у рэгіёне.

***Соймік***. Галоўным "нервам" жыцця шляхты быў мясцовы соймік, таму магнаты спрабавалі ўплываць на рашэнні гэтага важнага палітычнага інстытута. Полаччына была для Радзівілаў досыць складаным рэгіёнам, дзе іх уплывы не былі сталымі. Польская даследчыца У. Аўгустыняк слушна падкрэсліла, што мясцовы соймік не быў прывязаны да ніводнай палітычнай групоўкі: часамі тут відавочнай была перавага Радзівілаў, як у часы рокашу, а часам біржанскія ўплывы тут выяўляліся слаба, нават не гледзячы на прысутнасць на сойміках, як у 1640 г., цэлага шэрагу шляхціцаў, звязаных асабіста з Крыштапам Радзівілам (Мікалай Кунцэвіч, Пётр Казімір Юзафовіч, Мікалай Корсак) [26, s. 194, 217]. Гэта відаць як па змесце прынятых пастановаў, так і па складзе пасольскай рэпрэзентацыі ад Полацкага ваяводства, які мог быць цалкам пратэстанцкім, як у 1598 г. [1, с. 102]. Праўда, ультракаталіцкі характар некаторых пастаноў полацкага сойміка мог цалкам адпавядаць інтарэсам нясвіжскай галіны роду Радзівілаў, прадстаўнікі якой вызнавалі каталіцызм.

Сведчаннем зацікаўленасці біржанскіх Радзівілаў у падтрымцы полацкага сойміка з'яўляецца захаванне ў іх архіве пасольскіх інструкцый, створаных у Полацку. Да ліку такіх адносяцца пастулаты полацкага сойміка напярэдадні элекцыйнага 1632 г. і звычайнага сойма 1640 г. [8, 10]. Канешне ж, дакументы гэтыя трапілі ў радзівілаўскія зборы невыпадкова. Яны былі патрэбныя стратэгам біржанскіх Радзівілаў для выпрацоўкі плану дзеянняў падчас перадсоймавых кампаній і ўласна нарадаў. У такой

інфармацыі асабіста быў зацікаўлены Крыштап Радзівіл, што выдатна ілюструе нататка яго карэспандэнта з Полаччыны Андрэя Канінскага. У лісце з Ветрына ад 17.VIII.1632 г. А. Канінскі напісаў: "*Паведамляю вашай княскай міласці, маяму міласціваму пану, што соймік у Полацку адбыўся ў згодзе, усе канстытуцыі, прынесеныя з канвакацыі, былі прынятыя і пастаноўлена іх зацвердзіць на элекцыі. Паколькі павет памежны, то ўсе паехаць на элекцыю не маюць магчымасці,* ***таму абралі паслоў, спіс якіх пасылаю вашай княскай міласці, таксама як і пункты інструкцыі, дадзенай панам паслам***" [15, s. 1].

***Кліенты і карэспандэнты.*** Радзівілы на Полаччыне па меншай меры з канца XVI ст. мелі сталы штат карэспандэнтаў, якія інфармавалі сваіх апекуноў. Варта адзначыць, што ў сферу сваіх уплываў магнаты ўцягнулі прадстаўнікоў найбольш аўтарытэтных мясцовых сем'яў. Сталыя кантакты з Радзівіламі мелі Корсакі. Вядомы імёны цэлага шэрагу полацкіх шляхціцаў, якія з'яўляліся дворнымі слугамі Крыштапа Радзівіла [25, s. 152–165]. Напрыклад, прадстаўнікі Галубіцкай галіны роду Ян і Грэгоры з'яўляліся радзівілаўскімі карэспандэнтамі ў 1604 г і 1607 г. [25, s. 156]. Сярод Удзельскай галіны інфармацыю на біржанскі двор дасылалі ў 1622 г. Стэфан Корсак, у 1614–1617 гг. – Пётр, а ў 1629 г. – Юзаф Корсак [25, s. 156].

Радзівілы як нясвіжскай, так і біржанскай галін, па магчымасці, спрабавалі прасоўваць на пасады сваіх людзей у полацкай павятовай іерархіі [1, c. 171–173]. Сярод полацкіхураднікаў пачаткова на Радзівілаў быў зарыентаваны Пётр Казімір Беганскі, які быў слугой канцлера ВКЛ Альбрыхта Радзівіла, а з 1640 г. больш арыентаваўся на двор [28, s. 63].

Калі сыходзіць з размеркавання павятовых урадаў, прадстаўленых польскім гісторыкам М. Савіцкім, то ў біржанскіх Радзівілаў на пачатку 1650-х гадоў былі адносна абмежаваныя магчымасці ўплыву на Полаччыне. Ян Казімір у сваёй намінацыйнай палітыцы не быў паслядоўным і пасады раздаваліся прыхільнікам розных груповак. Сярод асоб, звязаных з біржанскім дваром, атрымальнікаў было няшмат [28, s. 172–173]. Тым не менш, біржанскія Радзівілы, несумненна, аказвалі падтрымку сваім пратэжэ. Сярод такіх быў Тамаш Храпавіцкі, які атрымаў полацкае гараднічтва ад Яна Казіміра [28, s. 173]. Да ліку біржанцаў належаў Крыштап Жаба, які ў 1654 г. трапіў у маскоўскую няволю [28, s. 173]. Значным поспехам біржанскіх Радзівілаў было прызначэнне на пасаду полацкага кашталяна ў 1654 г. Яна Сасноўскага, які з 1653 г. імкнуўся атрымаць нейкі сенатарскі ўрад [28, s. 132–133]. Наяўнасць між полацкіх ураднікаў сваіх людзей, а той жа кашталян фармальна быў другім па важнасці ўраднікам у ваяводстве, стварала аб'ектыўную аснову для прарадзівілаўскіх акцый полацкай шляхты такіх, як, напрыклад, падтрымка Кейданскай уніі 1655 г. [1, c. 214–216].

Такім чынам, пададзеныя кароткія тэзісы пра ролю Радзівілаў у полацкай гісторыі з'яўляюцца толькі ўступам ў гэтую важную тэму. Полацкая шляхта як асобная карпарацыя ў канцы XVI – першай палове XVII стст. знаходзілася ў шчыльным кантакце з домам Радзівілаў. Уплывы іх на Полаччыне былі няроўныя, але ў большай ці меншай ступені мелі месца ўвесь час.

Асаблівую зацікаўленасць да Полаччыны праяўляла біржанская галіна роду, якая імкнулася адначасова падтрымліваць і яднаць, а таксама абапірацца на пратэстанцкую меншасць у рэгіёне. Полацкая шляхта перманентна стварала т. зв. "масоўку" для розных ініцыятыў біржанскіх Радзівілаў, асабліва гэта выявілася ў крытычныя моманты гісторыі Рэчы Паспалітай. Зразумела, што за такой рэакцыяй стаяла мясцовая кліентэла магнатаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Галубовіч, В. Полацкая шляхта і дынастыя Вазаў / В. Галубовіч. – Мінск : А.М. Янушкевіч, 2016. – 224 с.
2. Грыцкевіч, А. Радзівілы / А. Грыцкевіч / Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2007. – Т. 2. – С. 503–504.
3. Грыцкевіч, А. Сапегі / А. Грыцкевіч / Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2007. Т. 2. – С. 545–550.
4. Катлярчук, А. У ценю Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае ў часе эўрапейскага крызісу XVII ст. / А. Катлярчук // Асобная адбітка з нумару "ARCHE" 7-8 за 2008 год. – 306 с.
5. Полоцкая ревизия 1552 года. – М. : Унив. тип., 1905. – 257 с.
6. Рахуба, А. Палітычныя групоўкі ў ВКЛ (1569–1732) / А. Рахуба // Спадчына. – 2002. – № 5–6. – С. 32–46.
7. Ткачоў, М. Замкі і людзі / М. Ткачоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 184 с.
8. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział II. Sygn. №. 1066.
9. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział II. Sygn. №. 1076.
10. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział. II. Sygn. № 1197.
11. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 976.
12. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 3214.
13. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 3861.
14. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 6760.
15. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 7129.
16. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 7277.



Polotsk.su

17. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 7295.
18. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 8563.
19. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 11944.
20. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 13406.
21. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 14777.
22. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 14885.
23. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 14931.
24. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. №. 19008.
25. Augustyniak, U. Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła (1585–1640) : mechanizmy patronatu / U. Augustyniak. – Warszawa : Wydawnictwo naukowe Semper, 2001. – 400 s.
26. Augustyniak, U. W służbie hetmana i Rzeczypospolitej: Klientela wojskowa Krzysztofa Radziwiłła (1585–1640) / U. Augustyniak. – Warszawa : Wydawnictwo naukowe Semper, 2004.– 398 s.
27. Lidkie, M. Od prawosławia do katolicyzmu. Ruscy możni i szlachta Wielkiego Księstwa Litewskiego wobiec wyznań reformacyjnych / M. Lidkie. – Białystok : Wydawnictwo uniwersytetu w Białymstoku, 2004.– 340 s.
28. Sawicki, M. Stronnictwo dworskie w Wielkim Księstwie Litewskim w latach 1648–1655 / M. Sawicki. – Opole : Mi-Graf Studio Grafiki Użytkowej, 2000. – 380 s.
29. Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba ; PAN. Bibl. Kórnicka. – Kórnik, 1994. – 255 s.
30. Wolff, J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego (1386–1795) / J. Wolff. – Kraków : Druk. Anczyca i Spółki, 1885. – 361 s.

## RADZIWILL FAMILY AND POLOTSK GENTRY IN THE END OF XVI – IN THE MIDDLE OF XVII CENTURIES

***V. GOLUBOVICH***

*Some aspects of the interaction of the Polotsk gentry with Radziwills magnate house are considered. Special attention is paid to the dimensions of Radziwills influence on the socio-political life of the local inhabitants.*

PolotskSU